# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*2023 год*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**11 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1.**

| **Часціны мовы, да якіх належаць амаформы** | **Словазлучэнні (сказы), якія ілюструюць лексічнае значэнне амаформаў (прыкладныя варыянты)** | **Падзел на марфемы** |
|---|---|---|
| *разрыў* – назоўнік | *разрыў снарада* | *раз-рыў* (прыстаўка, корань, нулявы суфікс, нулявы канчатак) |
| *разрыў* – дзеяслоў | *разрыў сховішча* | *раз-ры-ў* (прыстаўка, корань, суфікс, нулявы канчатак) |
| | | |
| *дам* – назоўнік | *свецкіх дам* | *дам* (корань, нулявы канчатак) |
| *дам* – дзеяслоў | *дам табе яблык* | *да-м* (корань, канчатак) |
| | | |
| *калі* – дзеяслоў (заг. л.) | *калі дровы* | *кал-і* (корань, канчатак; <u>*або*</u>: корань, суфікс, нулявы канчатак) |
| *калі* – прыслоўе | *Калі ты прыедзеш?* | *калі* (корань) |
| | | |
| *акуні* – назоўнік (мн. л.) | *спрытныя акуні* | *акун-і* (корань, канчатак) |
| *акуні* – дзеяслоў (заг. л.) | *акуні ў ваду* | *а-ку-н-і* (прыстаўка, корань, суфікс, канчатак; <u>*або*</u>: (прыстаўка, корань, суфікс, суфікс, нулявы канчатак) |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку – 0,25 бала.*

***Заўвага! У адпаведнасці з прапанаванымі словамі могуць прыводзіцца іншыя прыклады амаформаў, напрыклад:*** *калі (дзеяслоў) – калі (прыслоўе), калі (дзеяслоў) – калі (злучнік)*. ***Галоўнае патрабаванне – наяўнасць амаформы (не лексічнага амоніма, не амографа, не амафона)!***

**Заданне 2.**

А)

| Фразеалагізм | Значэнне | Кампанент | + |
|---|---|---|---|
| *як ... у (ў) бочцы* | ‘у вялікай колькасці. Пра мноства людзей у якім-н. месцы (у памяшканні, вагоне і пад.)’ | *зярнят* | |
| | | *бобу* | |
| | | *мёду* | |
| | | *селядцоў* | + |
| | | *кількі* | |
| *малая ...* | ‘нязначны, малаважны, неўплывовы чалавек’ | *птушка* | |
| | | *пташка* | |
| | | *сошка* | + |
| | | *шышка* | |
| | | *шапка* | |
| *... язык* | ‘круты і небяспечны паварот на дарозе’ | *цешчын* | + |
| | | *змяіны* | |
| | | *жабін* | |
| | | *сабакаў* | |
| | | *хамелеонаў* | |
| *ні слова ні ...* | ‘абсалютна нічога (не гаварыць, не адказваць, не расказваць і пад.)’ | *намёку* | |
| | | *гуку* | |
| | | *слоўца* | |
| | | *паўслова* | + |
| | | *сказа* | |
| *была ў ... хата* | ‘няма і не было каго-, чаго-н.’ | *малпы* | |
| | | *зайчыка* | |
| | | *вожыка* | |
| | | *ката* | |
| | | *сабакі* | + |

Б)

| | | | |
|---|---|---|---|
| *... языком* | агульнае значэнне ‘гаварыць упустую, пустасловіць’ | *малоць* | |
| | | *варочаць* | – |
| | | *мянціць* | |
| | | *пляскаць* | |
| | | *трапаць* | |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| **Склон і лік** | **Слова** | **Граматычныя формы** |
|---|---|---|
| Родны, множны | *апельсін* | – |
| Месны, адзіночны | *брат* | – |
| Творны, адзіночны | *кроў* | ***кроўю / крывёй (-ёю)*** |
| Творны, множны | *грош* | – |
| Месны, адзіночны | *каталог* | ***каталозе / каталогу*** |
| Родны, множны | *карусель* | ***каруселей / каруселяў*** |
| Родны, множны | *кніга* | – |
| Родны, множны | *рог* | ***рог / рагоў*** |
| Давальны, адзіночны | *збаўца* | – |
| Давальны, адзіночны | *імя* | ***імю / імені*** |
| Месны, адзіночны | *мост* | – |
| Родны, множны | *форма* | ***форм / формаў*** |

*За кожны правільны адказ –0,5 бала.*

**Заданне 4.**

| **Слова з тэксту** | **Лексіка-граматычная і граматычная характарыстыка** | **Выпраўленне памылкі (пры яе наяўнасці)** | **Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці)** |
|---|---|---|---|
| *немаўляці*[1] | Назоўнік: агульнага роду, рознаскланяльны | Назоўнік ніякага роду | *Немаўля* – яно, ніякі род |
| *цераз*[2] | Прыслоўе: акалічнаснае месца | Прыназоўнік | Слова *цераз* адносіцца да назоўніка *вопыт* і кіруе яго склонам, таму гэта прыназоўнік |
| *што*[3] | Злучнік: падпарадкавальны, тлумачальны | Правільна | – |
| *той*[4] | Займеннік: указальны, мае нулявы канчатак | Канчатак *-ой* | *Т-ой – т-ая – т-ое – т-ыя.* Відавочна, што канчатак *-ой* |
| *так*[5] | Часціца: сэнсавая, узмацняльная | Прыслоўе меры і ступені | Слова *так* адказвае на пытанне *наколькі?*, мае значэнне меры і ступені (раўназначнае значэннем прыслоўю *вельмі*), таму з’яўляецца прыслоўем |
| *створаных*[6] | Дзеепрыметнік: залежнага стану, утвораны ад дзеяслова *ствараць* пры дапамозе суфікса *-н-* | Утвораны ад дзеяслова *стварыць* пры дапамозе суфікса *-ан-* | Дзеепрыметнік *створаны* абазначае прымету прадмета паводле дзеяння, якое ўжо завершана, таму ўтварыўся ад дзеяслова закончанага трывання *стварыць*, адпаведна, пры дапамозе суфікса *-ан-* |

*За кожны правільны радок – 1 бал (0,5 бала за выпраўленне памылкі і 0,5 бала за яе тлумачэнне або 1 бал за сцвярджэнне правільнасці ў адпаведным прыкладзе).*

***Заўвага! Магчымыя іншыя правільныя тлумачэнні дапушчаных памылак.***

**Заданне 5.**

| Слоўнікавы артыкул | З якога слоўніка ўзяты артыкул? |
|---|---|
| БАРЭЛЬЕФ. Від скульптуры, у якой фігура выступае на плоскай паверхні менш чым на палавіну сваёй таўшчыні. | тлумачальны / тэрміналагічны (архітэктурная тэрміналогія) |
| БАРЭЛЬЕФ. Запаз. у XVIII ст. з франц. м. *bas-relief* (нізкая выпукласць). | слоўнік запазычаных слоў / этымалагічны (слоўнік паходжання слоў) |
| БАРЭЛЬЕФ. ад *-ба-* *і* *-рэльеф-*; *невытв.;* барэльефны, гарэльефны, рэльефны. | словаўтваральны |
| БАРЭЛЬЕ́Ф *м. НВ* барэлье́ф, барэлье́фа, барэлье́фу, барэлье́фам, барэлье́фе; *мн. НВ* барэлье́фы, барэлье́фаў, барэлье́фам, барэлье́фамі, барэлье́фах. | граматычны / арфаграфічны / Слоўнік беларускай мовы |

**Агульная задача (варыянт адказу):** Прывядзенне цэлай сукупнасці звестак пра словы, што выклікаюць пэўныя цяжкасці ў напісанні, вырашае задачу забеспячэння гэтых слоў такім гісторыка-лінгвістычным каментарыем, які павышае правапісную кампетэнтнасць носьбітаў мовы, паколькі веданне паходжання і асаблівасцей адаптацыі таго ці іншага запазычанага слова да сістэмы беларускай мовы робяць празрыстай яго ўнутраную структуру, якая можа абумоўліваць пэўныя нюансы напісання адпаведнай лексічнай адзінкі.

*За кожнае правільнае вызначэнне слоўніка – 1 бал, за прынцыпова правільнае вызначэнне агульнай задачы – 1 бал.*

**Заданне 6.**

Формула правільная для сказаў **2**, **4**, **5**.

*За кожнае правільнае вызначэнне праўдзівасці / непраўдзівасці формулы – 1 бал.*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Горны турызм адрозніваецца ад іншых відаў не спосабам перамяшчэння, а складанасцю маршруту. У горны турызм уваходзяць элементы альпінізму і скалалажання. Без спецыяльнай падрыхтоўкі ў горы хадзіць ні ў якім разе нельга: тут на кожным кроку ты можаш сутыкнуцца з чымсьці нечаканым. Не кожны лёгка пераносіць вышыню. А яшчэ ў гарах небяспечна абпальвае сонца, пагражальныя *(пагрозлівыя)* лавіны, снежныя карнізы. Не менш небяспечны і спелеатурызм, або пячорны турызм. Тут патрабуюцца спецыяльнае адзенне *(вопратка)* і рыштунак, веданне асаблівых *(адмысловых)* прыёмаў спуску, уздыму, лажання па вузкіх праходах, асаблівасцей пячор.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,5 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| **Тэрмін** | **Азначэнне тэрміна** | **Нумары прыкладаў** |
|---|---|---|
| Анафара | паўтарэнне аднолькавых гукаў (слоў, выразаў) у пачатку вершаваных радкоў або суседніх строф | 2, 5, 6 |
| Дактыль | трохскладовая стапа з націскам на першым складзе | 3, 6 |
| Санет | верш з 14 радкоў, напісаных ямбам | 1 |
| Эпіфара | паўтарэнне аднолькавых гукаў, слоў ці выразаў у канцы вершаваных радкоў або строф | 4, 5 |

*За прынцыпова правільнае азначэнне кожнага тэрміна – 0,5 бала, за правільнае вызначэнне месца прыклада – 0,5 бала.*

**Заданне 9.**

| ***Сцверджанне*** | ***Праўдзівае / непраўдзівае*** |
|---|---|
| Францыск Скарына першы ў гісторыі ўсходнеславянскай культуры выдаў пераклад Бібліі | + |
| У паэме “Кепска будзе!” Францішак Багушэвіч паказвае добрага чыноўніка, які дапамагае простым людзям змагацца з панам | |
| Усю прыгажосць спакойнага мора паказала Цётка ў аднайменным пейзажным вершы | |
| Сярод асноўных праблем п’есы “Раскіданае гняздо” Янкі Купалы – праблема зямлі і свабоды | + |
| Прататыпам Андрэя Лабановіча з трылогіі “На ростанях” з’яўляецца Якуб Колас | + |
| Максім Багдановіч у сваёй паэзіі пазбягаў тэмы горада, бо вельмі любіў вёску | |
| Алесь Гарун з’яўляецца аўтарам аднаго прыжыццёвага зборніка паэзіі | + |
| Максім Гарэцкі ўвасобіў канцэпцыю беларускага нацыянальнага характару ў мастацкай літаратуры | + |
| Змітрок Бядуля змагаўся супраць мадэрнізму ў літаратуры | |
| Ганна ў рамане “Людзі на балоце” Івана Мележа ўзяла шлюб з Яўхімам, бо больш не кахала Васіля, а пакахала Яўхіма | |
| Янка Брыль з’яўляецца адным з самых вядомых беларускіх аўтараў лірычнай прозы | + |
| Васіль Быкаў у “Знаку бяды” апраўдвае дзеянні і ўчынкі Зміцера Гужа, бо яго бацьку раскулачылі | |

*За кожнае правільнае вызначэнне праўдзівасці/непраўдзівасці сцверджання – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

Пісьменнік: Максім Гарэцкі.

*За правільна вызначанае імя – 0,5 бала, за кожнае правільна вызначанае месца – 0,5 бала, за беспамылковае вызначэнне аб'ектаў агляду кожнага месца – 1 бал, за часткова правільнае вызначэнне аб'ектаў агляду – 0,5 бала.*

*Рэклама ацэньваецца наступным чынам:*

| | |
|---|---|
| *1 бал* | *Тэкст мае адрасны характар (для вучняў старшых класаў), эфектыўны з пункту погляду мэты (пабуджае падарожнічаць па прапанаваным маршруце), вытрыманы стылёва.* |
| *0,5 бала* | *Тэкст або не мае адраснасці, або не з'яўляецца эфектыўным з пункту погляду мэты (не пабуджае падарожнічаць па прапанаваным маршруце), або стылёва не вытрыманы.* |
| *0 балаў* | *У тэксце адсутнічаюць або 2, або 3 з прапанаваных вышэй кампанентаў* |